ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
28 кастрычніка
1993 года
№ 15(1701)

ДОШКА АБ'ЯЎ

ПРАГРАМА ГРАНТАЎ

Міжнародны навуковы фонд (Фонд СОРАСА — Беларусь) аб'яўляе пачатак другога тура Праграмы Доўгатэрміновых Грантаў на навуковыя даследванні.

Тэкст дадзенай праграмы цалкам надрукаваны ў газеце «Поиск» 25—30 чэрвеня 1993 года. Яго таксама можна атрымаць па адрасу: г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 65, вучэбны корпус 11 А, Політэхнічная Акадэмія, к. 517 а. Апошні тэрмін прыёма заяў — 25 студзеня 1994 года.

А больш дасканалае знаёмства — на 2 старонцы.

ХТО ЁСЦЬ ХТО?

НАШ ЧАЛАВЕК У ПАРЛАМЕНЦЕ

У Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі С. С. Шушкевіча з'явіўся новы саветнік па эканамічных пытаннях. Ім стаў загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння САПР прафесар, доктар навук Міхась Міхайлавіч Кавалёў, супрацоўнік нашага універсітэта. Гэта прызначэнне выклікала ў сродках масавай інфармацыі рэспублікі вялікую цікавасць да М. М. Кавалёва, у прыватнасці, да ягонай эканамічнай праграмы.

Прафесар Кавалёў лічыць, што эканамічная сітуацыя ў Беларусі вельмі складаная: эканоміка краіны на мяжы развалу. І каб не здырылася канчатковага выбуху, трэба хутчэй праводзіць прыватызацыю.

На думку Міхася Міхайлавіча, Беларусь павінна ісці да станаўлення рынкавых адносін. І на гэтым шляху ён бачыць чатыры асноўныя састаўляючыя:

1. Народная прыватызацыя. Хутчэйшае накапленне крытычнай масы ўласнікаў;

2. Стварэнне ўласнай фінансавай сістэмы і правядзенне паслядоўнай фінансавай палітыкі;

3. Палітыка сацыяльнай справядлівасці. Дапамагаць трэба бедным людзям, а не розным «прамам», накшталт аграпрама;

4. Актыўная інтэграцыя ў сусветную эканоміку.

У сённяшніх умовах, зазначае новы саветнік Шушкевіча, трэба павялічваць экспарт беларускай прадукцыі ў Расію і эканоміць паліўна-энергетычныя рэсурсы...

Факт, што Станіслаў Шушкевіч прызначыў Міхася Кавалёва сваім саветнікам, сведчыць пра тое, што Белдзяржуніверсітэт па-ранейшаму лічыцца першай навучальнай установай на Беларусі. А яе выкладчыкі здольны не толькі рыхтаваць высокаякасных спецыялістаў, але і дапамагаць першым асобам краіны ў правядзенні дзяржаўнай палітыкі

СПЯШАЙЦЕСЯ!

Прэміі ад Акадэміі

Для актывізацыі навуковай работы студэнтаў, паглыблення іх тэарытычнай і практычнай падрыхтоўкі Акадэмія навук Беларусі заснавала пяць грашовых прэмій за лепшыя навуковыя работы студэнтаў у галіне гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук, роўных сямікратнай мінімальнай заработнай плаце кожная.

Прэміі прысуджаюцца да дня заснавання Акадэміі навук Беларусі.

На саісканне прэмій прадстаўляюцца звязаныя адзінай тэматыкай навуковыя работы за апошнія тры тады ў выглядзе:

— тэкста, у якім выкладзена мэта даследвання, выкананая работа і атрыманыя вынікі;

— надрукаваных навуковых работ;

— заявак на выдачу патэнтаў і аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы;

— камп'ютэрных праграм, і іншыя.

На конкурс выносяцца, як правіла, работы асобных аўтараў, у калектыўных працах колькасць сааўтараў абмяжоўваецца трыма.

Аўтарамі работ могуць быць студэнты беларускіх вышэйшых навучальных устаноў, маладыя спецыялісты і аспіранты могуць прадстаўляць работы, пачатыя ў гады навучання.

Тэрмін вылучэння работ на конкурс — да 1 снежня 1993 года.

Работа афармляецца ў трох экзэмплярах. Аўтар паведамляе пра сябе кароткія звесткі: год нараджэння, адукацыя, месца навучання, год паступлення ў ВНУ ці аспірантуру, месца працы (для маладых спецыялістаў), службовы і хатні тэлефоны, адрас.

Работы на конкурс могуць быць рэкамендаваны акадэмікамі, членамі-карэспандэнтамі АН Беларусі, вучонымі саветамі навуковых устаноў і ВНУ.

Дакументы дасылаюцца ў Прэзідыум Акадэміі навук Беларусі на адрас: 220072, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 66, п. 308, Камісіі па прэміях Акадэміі навук Беларусі. Камісія перадае матэрыялы работ, дасланых на конкурс, на папярэдні разгляд у адборачныя камісіі Аддзяленняў навук АН Беларусі ў адпаведнасці з іх тэматыкай. Работы, якія атрымалі падтрымку Аддзяленняў, у месячны тэрмін разглядаюцца Камісіяй па прэміях АН Беларусі. Прэміі прысуджаюцца Прэзідыўмам АН Беларусі (т. 39-45-07).

Дыпломы лаўрэатаў уручаюцца пераможцам конкурса на пасяджэнні Прэзідыума АН Беларусі.

МЫ — ШКОЛЕ

ДАЛЁКАЕ ЦІ БЛІЗКАЕ

З 19 па 21 кастрычніка ў галоўным корпусе Белдзяржуніверсітэта прайшла II Рэспубліканская выстава пад назвай «Школа і камп'ютэр».

На працягу трох дзён зацікаўленыя асобы маглі не толькі паглядзець на новыя камп'ютэры мінскай маркі (МВАВТ), праграмнае забеспячэнне для іх, але і на месцы заключыць дагаворы з вытворцамі.

Што было прапанавана арганізатарамі выставы? Навучальныя праграмы для школьнікаў і студэнтаў па самых розных дысцыплінах, аўтаматызаваныя сістэмы кіравання навучальнымі ўстановамі, праграмы бухгалтарскага ўліку і іншыя.

Наведаўшы выставу, можна было прыкладна ўявіць сабе школу будучага: навучальны цыкл камп'ютэрызаваны, аўтаматызаваны ўсе сістэмы школьнага кіравання. Толькі ці можна зараз сказаць, якое гэта будучае — далёкае ці блізкае? Калі нашы школы будуць настолькі багатымі, каб закупіць усю гэтую тэхніку?

КАНФЕРЭНЦЫІ

БЕСПЕРАПЫННАЕ НАВУЧАННЕ

Два дні — 27 і 28 кастрычніка гэтага года — працавала навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы бесперапыннай шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў у навучальных установах новага тыпу», якая ладзілася Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскім інстытутам прафесіянальнай адукацыі.

Канферэнцыя абмеркавала назапашаны вопыт работы навучальных устаноў новага тыпу і паспрабавала вызначыць падыходы да стварэння ў нашай рэспубліцы эфектыўнай сістэмы бесперапыннай прафесіянальнай адукацыі. Падчас канферэнцыі ішла гутарка пра наступныя пытанні:

1. Умовы стварэння і крытэрыі навучання і выхавання ў вышэйшых прафесіянальных вучылішчах (ВПВ), каледжах, вучэбна-навуковых аб'яднаннях, комплексах і іншых прафесіянальна-адукацыйных структурах інтэграванага тыпу.

2. Арганізацыйная структура ўстаноў новага тыпу і мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў у сістэме бесперапыннай адукацыі.

3. Прафесіянальны адбор, атэстацыя і дыягностыка навучэнцаў у навучальных установах новага тыпу.

4. Падыходы і прынцыпы адбора і пастраення зместу агульнай і прафесіянальнай адукацыі ў навучальных установах новага тыпу.

5. Педагагічныя тэхналогіі падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў у структуры бесперапыннай прафесіянальнай адукацыі.

6. Шляхі ўзаемадзеяння навучальных устаноў з работадаўцамі ва ўмовах станаўлення рынкавых адносін.

7. Шляхі і формы навукова-метадычнага і матэрыяльна-тэхналагічнага забеспячэння навучальных устаноў новага тыпу.

8. Прававая аснова рэгулявання дзейнасці навучальных устаноў.

9. Навучальныя ўстановы новага тыпу і рынак адукацыйных паслуг.

А ЎВАС? А ЎНАС!

ААН У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ

21 кастрычніка ў чытальнай зале замежнай літаратуры Фундаментальнай бібліятэкі БДУ адбылося ўрачыстае адкрыццё кніжнай выставы, прысвечанай ролі ААН у сучасным свеце. Гэта падзея непасрэдна прымеркавана да міжнароднага дня ААН, які штогод адзначаецца 24 кастрычніка.

У арганізацыі выставы прынялі актыўны ўдзел Нацыянальная бібліятэка Беларусі і пастаяннае прадстаўніцтва ААН у нашай краіне. Таму была заканамернай прысутнасць на цырымоніі адкрыцця пастаяннага прадстаўніка ААН Мэцью Каханэ і ягонага намесніка В. В. Ткачука. Ад універсітэта прысутнічалі першы прарэктар П. Д. Кухарчык, начальнік управлення па міжнародных сувязях В. Г. Шадурскі, дэкан юрфака В. М. Гадуноў.

Алесь ЮРЫН.

ПАСЛЯ ДОЖДЖЫЧКА...

У КОЖНУЮ ДРУГУЮ СЕРАДУ

Адбыўся арганізацыйны сход першага «Канадскага клуба» на Беларусі.

Студэнтаў, зацікаўленых і проста цікаўных, прыйшло даволі многа. Працягваўся сход амаль дзве гадзіны, пасля чаго найбольш актыўная частка студэнтаў кінулася ў Нацыянальную бібліятэку зандзіраваць глебу наконт таго, якая інфармацыя аб Канадзе маецца на Беларусі. На наступным сходзе, які адбудзецца ў сераду 10 лістапада а 19 гадзіне ў актавай зале ў памяшканні гістфака па вуліцы Чырвонаармейская, 6, усё стане дакладна вядома. Дарэчы, на гэты сход «Канадскі клуб» запрашае ўсіх, хто жадае, можа і мае час займацца (для пачатку) зборам інфармацыі аб Канадзе, весці перапіску.

НУ І НУ!

ІСПЫТ ДЛЯ ШЭРЫФА

Незвычайная пасада з'явілася ў Хабараўскім тэхнічным універсітэце — шэрыф. Вопытны прафесіянал узначаліць спецыяльнае аддзяленне па ахове парадка і абароне студэнтаў. Гэта было выкліканa напружаным крыміногенным становішчам. Апошняй кропляй была смерць студэнта, які быў пабіты хуліганамі да смерці літаральна ў альма-матэр.

МЁРТВЫМ НЕ БАЛІЦЬ?

З 19 па 22 кастрычніка ў Беларусі праходзілі Дні памяці ахвяр яўрэйскага генацыду. Значнасць падзеі трэба разглядаць як з'яву не толькі для Беларусі, але і для ўсяго цывілізаванага супольніцтва.

Пяцьдзесят гадоў прайшло з таго жахлівага дня, калі фашысты ўчынілі пагром у мінскім гета. Кажуць, час — лепшы лекар. Але не для ўсіх і не заўсёды. І яшчэ доўга будзе зажываць гэты крывавы рубец у свядомасці нашага народа — народа Беларусі. І дай Бог, каб ён не зажыў ніколі. Таму што ён можа разрубцавацца зноў, цягнучы за сабой кроў, жах, бездань... І таму Беларусь адзначае Дні жалобы.

Праграма гэтых Дзён вельмі насычаная. Пачаліся яны 19 кастрычніка з адкрыцця ў Палацы мастацтваў рэтраспектыўнай выставы «Ад Шагала ў мінулае і сучаснасць». 20 кастрычніка адбылася паездка па месцах расстрэлаў яўрэяў з наведваннем мемарыялаў. 21 кастрычніка народ сабраўся на мітынг на месцы знішчэння мінскага гета (вул. Заслаўская), потым было шэсце па вуліцы Сухой і адкрыццё мемарыяльнай дошкі ахвярам генацыду. 22 кастрычніка быў апошнім днём жалобы, ён быў адзначаны канцэртам-рэквіемам.

Юрась КАРМАНАЎ.

ВЫ ЧУЛІ?

АТЫ-БАТЫ

Пачынаючы з гэтага навучальнага года ваенная кафедра БДУ пачала рыхтаваць спецыялістаў для Узброеных Сіл Беларусі па двум профілям: «ваенны псіхолаг» і «юрыскансультант па выхаванню і інфармацыі».

— Для якаснай падрыхтоўкі студэнтаў,— сцвярджае начальнік ваеннай кафедры універсітэта палкоўнік Ю. І. Бальшакоў,— ёсць усе ўмовы. Своечасова распрацаваны адпаведныя праграмы, ствараецца вучэбна-матэрыяльная база. А права весці навучанне і выхаванне студэнтаў атрымалі выкладчыкі афіцэры запасу А. Конанаў, В. Беспразваны, капітан Д. Шаўчук.

Васіль АРОН.

Умельцы з горада Кельцы

ДЭЛЕГАЦЫЯ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА НЯДАЎНА ВЯРНУЛАСЯ З РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА, ДЗЕ ЯНА ПРЫСУТНІЧАЛА НА ЦЫРЫМОНІІ ІНАГУРАЦЫІ Ў ПЕДАГАГІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ ГОРАДА КЕЛЬЦЫ І ГОРАДА ПЯТРОЎ-ТРУБЕЦКІ. РЭКТАР УНІВЕРСІТЭТА Ф. М. КАПУЦКІ І ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ А. Г. СЛУКА РАСКАЗВАЮЦЬ АБ СВАІХ УРАЖАННЯХ.

Хто ўпершыню наведвае галоўны корпус польскага педагагічнага інстытута звяртае ўвагу не толькі на нейкую асаблівую ўтульнасць і акуратнасць, але і на прывабныя ўпрыгожванні на сценах, выкананыя ў стылі польскіх народных традыцый. Аказалася, што ўсё гэта справа заўзятых майстроў — студэнтаў з аматарскай студыі мастацтваў. «Умельцы з горада Кельцы»,— трапна заўважыў адзін з членаў беларускай дэлегацыі. Аднак поўны сэнс гэтых слоў адкрыўся значна пазней, калі мы пазнаёміліся з працай прафесуры, вучобай студэнтаў і ўбачылі, як у суседняй краіне шануюць гісторыю, узбагачаюць сучаснасць і клапоцяцца аб будучыні.

Урачыстая інагурацыя, а праазічна — пачатак навучальнага года (у Рэспубліцы Польшча з 1 кастрычніка) — гэта падзея, якая спалучае ў сабе мноства абавязковых, але прыемных мерапрыемстваў: справаздачу рэктара перад сенатам, прысвячэнне першакурснікаў у студэнты, знаёмства студэнтаў з таямніцай навукі і рытуальны момант перадачы традыцый новаму пакаленню моладзі.

У прывабнай зале, дзе адбываецца інагурацыя, у прызначаны час арганізавана збіраюцца студэнты і супрацоўнікі. Афармленне: кветкі, эмблема навучальнай установы, лозунг на сцэне «Чалавек не плануе пройгрыш, прайграе той, хто не плануе!», вельмі прыгожае адзенне прысутных — падкрэсліваюць урачыстасць. На сцэну выходзяць гарністы і абвяшчаюць пачатак свята. Прысутныя ўстаюць і вітаюць сенат, які ўваходзіць у залу. Кожны з іх апрануты ў прафесарскую мантыю і капялюш чорнага колеру. Шэсце ўрачыстае і хвалюючае. Ва ўсім захоўваецца строгая субардзінацыя. Наперадзе нясуць факелы, а затым ідуць самыя маладыя члены сената — студэнты. А потым па ўзросту і вучонай мудрасці — дактары і прафесары, далей — дэканы і прарэктары, самыя ганаровыя госці — рэктары запрошаных вышэйшых навучальных установ. Мантыі дэканаў і прарэктараў вызначаюцца каштоўным убраннем, аздоблены мехам; кожны з іх адзначаны нагрудным знакам на цяжкой падвесцы. Замыкае шэсце сената рэктар у шыкоўным убранні са скіпетрам у руках.

Сенат размяшчаецца перад сцэнай з правага боку, насупраць яго сядзяць першакурснікі.

Дэканы, прарэктары і ганаровыя госці падымаюцца на сцэну і размяшчаюцца ў прэзідыуме.

Рэктар кладзе скіпетр на спецыяльную падушку на стале і запрашае прысутных устаць. У гэты момант сцяганосцы з асістэнтамі ўносяць сцягі інстытута. Гучыць гімн «Яшчэ Польска не згінела».

Падзея набывае ўрачыстасць, узнёсласць, эмацыянальнасць. Прысутным прадстаўляюцца ганаровыя госці. На інагурацыю прыехалі дэлегацыі вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, Германіі, Славакіі, Украіны, польскіх універсітэтаў і інстытутаў, запрошаны ваяводскае свецкае і духоўнае кіраўніцтвы, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў адукацыі, нават пасол замежнай краіны.

Пасля гэтага рэктар Кельцкага педагагічнага інстытута, вядомы ў Польшчы і за яе межамі вучоны-біёлаг, аўтарытэтны арганізатар вышэйшай адукацыі, чулы, адкрыты прафесар Адам Калантай выступіў з дакладам, які змясціў у сабе і экскурс у гісторыю педагогікі і вышэйшай адукацыі, і кароткі, але змястоўны абрыс працы інстытута за год з прыкладамі дасягненняў у вучобе, навуцы і грамадскай дзейнасці. Мяркуючы па ўсяму, гэтыя здабыткі даволі значныя. Вучоныя інстытута распрацоўваюць важныя даяржаўныя праграмы, звязаны творчымі сувязямі з многімі замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Інстытут, і такога няма ў ніводным іншым інстытуце або універсітэце, мае свайго прадстаўніка ў сенаце і двух дэпутатаў ва ўрадзе Польшчы.

Даклад рэктара быў праслуханы з глыбокай пачцівасцю і ўвагай, бо ён не толькі знаёміў прысутных з дзейнасццю інстытута, але ўводзіў першакурснікаў у ранг раўнапраўных членаў калектыва на ўзроўні дзейнасці сената.

Пасля даклада рэктара выступілі кіраўнікі мясцовых органаў кіравання, духавенства, ганаровыя госці. І, як абавязковы атрыбут свята,— выступленне студэнтаў старэйшага курса, своеасаблівая павага альма-матэр, рэктару, прафесуры за навуку.

Наступіў асабліва ўрачысты момант. Раздаюцца песнапенні хора. Прысутныя ўстаюць, першакурснікі выстрайваюцца перад сцэнай. Першы прарэктар выходзіць наперад, абвяшчае словы студэнцкай прысягі. А маладыя людзі зладжана і з хваляваннем паўтараюць пранікнёныя запаветы, якія далучаюць іх да таямніц навукі, невычэрпных далягляданў ведаў, сталага жыцця і пачэсных традыцый вышэйшай школы. Гучыць клятва на вернасць роднаму народу і сваёй краіне.

Першакурснікі пад хвалюючыя гукі «Гаудэамуса» атрымліваюць студэнцкія білеты і залікоўкі, а потым падымаюцца на сцэну, падыходзяць да рэктара, які лёгкім дакрананнем скіпетра да пляча благаслаўляе іх на цяжкі, але пачэсны шлях у навуку.

Усё гэта адбываецца чынна і высакародна, спакойна, без нярвовасці і штучнай нацягнутай атмасферы. Людзі ў зале разумеюць, што знаходзяцца на ўрачыстасці, якая варта глыбокай павагі. Уся ўрачыстасць аздоблена цудоўнай фартэп'яннай музыкай Шапэна, Бетховена, што гучыць са сцэны ў выкананні прызнанага майстра.

На заканчэнні свята аб'яўляюцца загады польскага ўрада, Міністэрства адукацыі, рэктарата аб узнагародах выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Узнагарод было так многа, што склалася ўражанне, быццам адзначаны быў увесь выкладчыцкі калектыў. Некалькі дактароў атрымалі вельмі высокую пашану: залаты ці сярэбраны крыж.

Урачыстасць вянчаецца шыкоўным выхадам сената. Зноў наперадзе ідуць маладыя. Мудрасць прафесуры перадаецца новаму пакаленню, якому нельга засціць шлях у будучыню. Таму прафесарскія мантыі і свяцейшаства рэктар ідуць апошнімі. Наперадзі свет іх вучонасці і святасці...

Інагурацыя — шанаванне новага навучальнага года. Можа, ад гэтай традыцыі, а, можа, ад таго, што ў Польшчы па-новаму ўсвядомлены каштоўнасці вышэйшай адукацыі, што ў першую чаргу звязана з растучым беспрацоўем, студэнты да вучобы адносяцца адказна. Заняткі пачынаюцца у восем гадзін раніцы, і кожны дзень, як мінімум,— тры акадэмічныя лекцыі па сорак пяць хвілін кожная з перапынкамі ў пяць і дзесяць хвілін. Гэта значыць, дзейнічае ўсталяваная класічная сістэма арганізацыі заняткаў. Дзейнічае і стары спосаб праверкі наведвання лекцый прадэканам (намеснікам дэкана): па спісу, а адзнакай, хто прысутнічае, хто адсутнічае. Студэнты адносяцца да гэтага спакойна, не так, як у нас, з пагардай. Гутаркі пра свабоднае наведванне не вядуцца. Існуе просты закон: калі не супрацьстаяць, то пасрэдная маса будзе павялічвацца, а для вышэйшай адукацыі — гэта дэградацыя. Таму польскія вучоныя не пускаюць навучанне і выхаванне на самацёк. Асноўны кантроль выконваюць выкладчыкі, якія працуюць са студэнтамі кожны дзень, добра ведаюць іх звычкі і магчымасці. Большасць студэнтаў згодны з такім кантролем і лічаць яго дэмакратычнай з'явай.

Урад і кіраўніцтва народнай адукацыі і маральна, і матэрыяльна імкнуцца падтрымаць еўрапейскі ўзровень вышэйшай школы. Гэта ўвасабляецца ў тым, што інстытут мае дастатковую колькасць вучэбных карпусоў і аўдыторый, шмат кабінетаў, лабараторый, сучасных прыбораў і камп'ютэраў, буфетаў і кафэ. Таму ў Кельцкім інстытуце, нягледзячы на вялікую колькасць навучэнцаў, на кожнага прыходзіцца даволі вялікая агульная аўдыторная плошча. Такой пераселенасці, як у нас, там не наглядаецца.

Зразумела, што ў вялікім калектыве (у інстытуце больш 11 тысяч студэнтаў) бывае рознае: пропускі заняткаў, адлічэнне па розных прычынах, ёсць і студэнты, якія дрэнна вучацца. Але студэнцкае асяроддзе накіравана на добрую вучобу, каб мець магчымасць атрымаць добрую работу па спецыяльнасці. Дзяржаўнага размеркавання няма. У рыначных умовах кожны сам сабе гаспадар!

У нашым універсітэце яшчэ толькі абмяркоўваецца праблема адкрытага прыёму. На некаторых спецыяльнасцях ужо праведзены эксперыменты. А ў нашых суседзяў адкрыты прыём стаў фактычна нормай. Праўда, гэта цэлая сістэма арганізацыйных, метадычных і прававых мер, якая дазваляе рэгуляваць прыток таленавітай моладзі. Акрамя таго, сенат мае права праводзіць адкрыты прыём, а на факультэтах, дзе конкурс асабліва вялікі, уводзіць уступныя экзамены.

Нельга пераказаць уражанні ад прыбывання ў гасцінным доме суседзяў-калег. Аднак яшчэ можна ўспомніць пра адзіны клопат, які хваляваў усіх вучоных, што сабраліся ў Кельцкім педінстытуце. З боку нашай дэлегацыі была ўзнята праблема неабходнасці яднання славянскіх народаў і краін ў сучасных умовах. Гэта было падтрымана і развіта ў агульнай размове.

Відавочна, што падзеі апошніх гадоў на еўрапейскім кантыненце фактычна перарвалі гістарычныя, эканамічныя і культуралагічныя сувязі паміж славянамі. Факты гарачай сучаснасці сведчаць, што між славянскімі краінамі ўзнікае напружанасць, расце тэрытарыяльная незадаволенасць, нацыянальная ізаляванасць, праяўляюцца міжусобіцы і нават узброеныя канфлікты. Югаславія ператварылася ў гарачую кропку. Там ідзе грамадзянская вайна. Усе славянскія краіны апынуліся ў стане запяжнога эканамічнага крызісу. Законы вытворчай узаемадапамогі парушаны ідэалагічнымі пастулатамі, і гэты працэс набывае незваротны характар.

Акрамя таго, у апошні час з боку буйнейшых і найбольш развітых краін яскрава праяўляецца ідэалагічная экспансія ў адносінах да славянскіх народаў. Пад выглядам дэмакратычных пераўтварэнняў і далучэння да сусветнай цывілізацыі праводзіцца непрыкрытая каланіяльная палітыка супадчынення сыравінных, энэргетычных каналаў, укаранення інвестыцыйным шляхам пасрэдных тэхналогій. Катастрафічна адстаючыя славянскія краіны пад напорам шырпатрэбу высокаразвітых дзяржаў ператвараюцца ў плацдарм збыту непатрэбнай прадукцыі.

Ідзе вельмі моцны наступ на асновы славянскай маралі і самабытнасць культуры. Масавая буржуазная антыкультура на парнаграфічным узроўні мэтанакіравана пранікае ў самую сэрцавіну непаўторнай і магутнай цывілізацыі славянскіх народаў. Яскрава праследжваецца мэта: расхістаць тысячагадовыя славянскія карані, ператварыць амаль палову зямной сушы ў палігон наладкі дабрабыту рыначнікаў, капіталістаў, мільярдэраў і інш. надцывілізаных эксплуататараў свету.

Гэта пагражае славянству яшчэ ў большай ступені, чым паўстагоддзя назад, калі на яго замахваўся фашызм.

На гэтай выснове наспела неабходнасць аб'яднання славянскіх народаў на моцным падмурку гістарычнага брацтва з улікам сучасных геапалітычных абставін.

Да гэтай думкі прыйшлі ўсе ўдзельнікі сустрэчы ў Польшы. Навука павінна быць актуальнай сілай у пошуку не традыцыйнага, а свайго, славянскага, шляху ў прасторы і часе. Яна здольна абгрунтаваць эфектыўны выхад брацкіх краін з зацяжнога эканамічнага крызісу, вызначыць аб'ектыўны шлях самастойнага развіцця і выкарыстаўшы ўсе сучасныя дасягненні разглядзець перспектыву славян, якія ва ўсе часы былі апорай і маральным накірункам развіцця ўсіх народаў.

Было прынята рашэнне ў сярэдзіне наступнага года правесці ў Польшы навуковую канферэнцыю пад умоўнай назвай «Інтэграцыя славянскіх народаў у сучасных умовах» і запрасіць на яе навукоўцаў з усіх славянскіх краін. Гэта неаднаразовая акцыя. Канферэнцыя павінна стаць асновай шырокага вывучэння глабальнай праблемы развіцця славянскіх народаў у сучаснасці, захавання агромістых культурных пластоў, іх гісторыі і стварэння неабходных умоў для цывілізаванага ўваходу магутнай зямной часткі людзей у новае тысячагоддзе.

* * *

У час візіту універсітэцкай дэлегацыі быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве з Кельцкім педінстытутам па ўсім накірункам дзейнасці вышэйшай школы.

А. СЛУКА,
дэкан факультэта журналістыкі.

САКРЭТ ФІРМЫ

А Ў НАС... АДКЛЮЧЫЛІ ГАЗ

15 кастрычніка студэнты Беларускага тэхналагічнага інстытута аб'явілі страйк. Цярплівасць студэнтаў скончылася, калі ў адным з інтэрнатаў адключылі газ. Крыху раней будучыя тэхнолагі былі пазбаўлены гарачай вады і цяпла. Па словах рэктара інстытута І. М. Жаскага, яшчэ некалькі гадоў таму Саўмін прыняў рашэнне перавесці інтэрнаты на карыстанне электрычнымі плітамі замест газавых. Аднак з-за адсутнасці сродкаў неабходныя работы не былі праведзены. Затое спраўна выконваецца пастанова ў другой частцы — адключаны газ. Пасля гутаркі з рэктарам студэнты вырашылі прыпыніць страйк і пачакаць наступнага рашэння гаргазу.

УНІВЕРСІТЭТАЎ МНОГА, БДУ — АДЗІН

Наваполацкі палітэхнічны інстытут перайменаваны ў Полацкі дзяржаўны універсітэт. Змяненне статусу — вынік настойлівай і плённай працы ў правядзенні пераўтварэнняў. Да традыцыйных тэхнічных універсітэтаў далі новыя: радыётэхнічны, фінансава-эканамічны, замежных моў.

Паладчанам застаецца толькі пашкадаваць, што імя Францыска Скарыны ўжо носіць адзін з беларускіх універсітэтаў.

P.S. Тым часам кампанія па перайменаванню інстытутаў працягваецца. Па-новаму гучаць сёння назвы Мінскага інстытута культуры, Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў, Гомельскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту — Беларускі універсітэт культуры, Беларускі лінгвістычны універсітэт, Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту.

МАНІЛАЎ З ДАНБАСА?

Рэктар Міжнароднага інстытута кіравання бізнеса і права, што ў горадзе Славянску Данецкай вобласці, Ф. Паддубны «папярэдзіў» прэзідэнтаў Украіны і ЗША, а таксама кіраўніцтва Гарвардскага універсітэта, што «бярэцца за стварэнне Гарварда на Украіне». Доктар эканамічных навук заявіў, што за два бліжэйшыя гады будзе здадзена першая чарга вучэбных і гасцінічных карпусоў для студэнтаў, пабудаваны катэджы для выкладчыкаў, спартыўна-аздараўляльны корпус, тэнісныя корты, іпадром і нават невялікія царква і аэрадром.

У ГОРКАХ ГАЛАДАЕ ЭФІОП

Не маючы грошай, некалькі месяцаў ледзь трымаецца грамадзянін Эфіопіі Мезгэбэ Тсэгайе.

Намеснік дэкана Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі М. Старавойтава распавяла, што ў такім становішчы знаходзяцца многія замежныя студэнты, нават тыя, хто паспяхова скончыў ВНУ. Па яшчэ саюзнаму дагавору іх праезд на радзіму павінна аплаціць Масква.

ДАСКАНАЛАЕ ЗНАЁМСТВА

Міжнародны навуковы фонд (МНФ) — амерыканская дабрачынная арганізацыя, заснаваная ДЖОРДЖАМ СОРАСАМ. Гэта прыватная арганізацыя, на два гады дзейнасці якой выдаткавана 100 млн. долараў. Фонд імкнецца да шырокага міжнароднага супрацоўніцтва.

АДНА З ГАЛОЎНЫХ ЗАДАЧ ФОНДА — падтрымка навукі і вучоных у незалежных дзяржавах, былых рэспубліках СССР. У сферу інтарэсаў Фонда ўваходзіць усебаковае спрыянне фундаментальным даследванням у галіне прыродазнаўчых навук.

МЭТЫ ФОНДА: захаванне і развіццё дасягненняў навукі ў былым СССР, а таксама ўкараненне максімальна эфектыўных метадаў арганізацыі і фінансавання навуковых даследванняў.

АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ДЗЕЙНАСЦІ ФОНДА. Міжнародны навуковы Фонд аказвае падтрымку індывідуальным даследванням і групам вучоных. Экспертная ацэнка заяў на фінансаванне праходзіць на конкурснай аснове.

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА ФОНДА. На чале Фонда стаіць Савет апекуноў, які ўзначальвае Джордж Сорас. Цякучую дзейнасць Міжнароднага навуковага фонда ажыццяўляе Выканаўчы камітэт. У Выканаўчы камітэт МНФ уваходзяць вядомыя вучоныя: акадэмікі Расійскай Акадэміі навук В. Скулачаў і Л. Акунь, Ю. Глеба (Украіна), А. Янулайціс (Літва). У Расіі і шэрагу іншых рэспублік былога СССР, у тым ліку і ў Беларусі, дзейнічаюць кансультатыўна-назіральныя саветы.

ПРАГРАМЫ, ШТО ПРАВОДЗЯЦЦА ФОНДАМ. Першая — гэта праграма хуткай дапамогі. МНФ ажыццяўляе яе з вясны 1993 года. Мэта праграмы хуткіх індывідуальных грантаў — падтрымка жыццёвага ўзроўню актыўна працуючых вучоных і выдзяленне з гэтай мэтай стыпендыі ў памеры 500 долараў. На Беларусі стыпендыятамі з'яўляюцца 672 чалавека.

Наступная праграма — праграма доўгатэрміновых грантаў. 25 чэрвеня 1993 года Фонд аб'явіў аб пачатку гэтай праграмы, якая будзе праводзіцца ў два туры. У рамках праграмы прадугледжваецца падтрымка навуковага персанала, фінансаванне набыцця абсталявання, расходных матэрыялаў, навуковых камандзіровак, тэлекамунікацый і інш. Беларускае прадстаўніцтва МНФ прымае заявы да 25 студзеня 1994 года.

Існуе таксама і праграма дапамогі для паездак на канферэнцыі за мяжу. Дапамога ўключае аплату авіябілетаў у абодва бакі, а таксама пакрыццё сутачных выдаткаў. Заявы па дадзенай праграме прымаюцца Вашынгтонскім офісам Фонда толькі ад арганізатараў канферэнцыі не меней, чым за 12 тыдняў да пачатку канферэнцыі.

Сярод праграм Фонда ёсць і праграма дапамогі навуковым бібліятэкам, якая прадугледжвае камплектаванне бібліятэчных фондаў, і праграма па развіццю тэлекамунікацый на Беларусі, якая знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі.

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

ПЕРШЫ РЭКТАР

21 кастрычніка — 115 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Іванавіча Пічэты (1878—1947).

Жыццёвы і творчы лёс Уладзіміра Іванавіча Пічэты цесна звязаны з Беларуссю. Нарадзіўся ён у Палтаве ў сям'і рэктара духоўнай семінарыі. Менавіта бацька садзейнічаў фарміраванню ў сына зацікаўленнасці да гісторыі.

У. І. Пічэта бліскуча закончыў Маскоўскі універсітэт, дзе пад кіраўніцтвам В. В. Ключэўскага распачаў першыя навуковыя даследванні. З 1903 года, калі была нарукавана яго першая навуковая праца, і на працягу 44 гадоў напружанага даследчага пошуку У. І. Пічэта напісаў больш за 500 кніг, артыкулаў, рэцэнзій. Пераважная большасць іх датычыцца гісторыі Расіі, Беларусі, Украіны, Польшчы і іншых славянскіх краін і народаў. Амаль чвэрць навуковых даследванняў гісторык зрабіў, калі працаваў на Беларусі. Ён стаяў ля вытокаў беларускай навукова-гістарычнай школы, быў адным з арганізатараў вышэйшай адукацыі.

Да 1917 года Уладзімір Іванавіч выкладаў славянскую і расійскую гісторыю ў Маскоўскім універсітэце, у народных універсітэтах і школах многіх гарадоў Расіі. За манаграфію «Аграрная рэформа Жыгімонта — Аўгуста ў Літоўка—Рускай дзяржаве» гісторыку былі прысуджаны вучоныя ступені магістра і доктара.

З 1918 года Пічэта распачаў курс лекцый па гісторыі Беларусі ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве. Ён быў абраны старшыней Беларускага навукова-культурнага таварыства, прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы стварэння Беларускага універсітэта ў Мінску.

10 ліпеня 1921 года Уладзімір Іванавіч Пічэта быў прызначаны рэктарам БДУ. Менавіта дзякуючы яго намаганням першы універсітэт на Беларусі з першых гадоў існавання стаў буйным навуковым, адукацыйным, культурным цэнтрам.

Але паступова на жыццёвы небасхіл гісторыка набеглі чорныя хмары. Спачатку «кампетэнтныя органы» раз-пораз пачалі выяўляць «нацыяналшавіністычныя і антысавецкія настроі» універсітэцкай інтэлігенцыі, потым — «варожыя элементы». У кастрычніку 1929 года У. І. Пічэта не быў абраны рэктарам. За ім захавалі толькі пасаду прафесара. А праз год ён быў арыштаваны і апынуўся пад следствам сярод 115 прадстаўнікоў навукі і адукацыі, якім было прад'яўлена абвінавачванне ў дзейнасці з мэтай «... хутчэйшага здзяйснення планаў інтэрвенцыі супраць СССР». У дадатак Пічэта быў адзначаны як беларускі буржуазны нацыяналіст і вялікадзяржаўны шавініст. Ні больш ні менш! Гісторыка саслалі ў Вятку, потым — у Варонеж.

У 1935 годзе яго вярнулі ў Маскву. У АН СССР і Маскоўскім універсітэце ён да апошніх сваіх дзён вёў напружаную навуковую і педагагічную работу.

А. ЯНОЎСКІ.

КАМУНІЗМ — НЕ ПРЫВІД

Во былі часы, хлеба не было, і прыходзілася турыстам есці сала з шакаладам і са згушчаным малаком. А так сапраўды харчаваліся студэнты нашага геаграфічнага факультэта, у цягніку, калі ўжо вярталіся дадому з прыемнага падарожжа па гарам Каўказа.

Алег Копаць, трэцякурснік геафака, дасягнуў на гэты раз неверагоднага. Ён не толькі ўзышоў на Усходнюю вяршыню каўказскага гіганта — Эльбруса, а яшчэ й падняў над ёю бел-чырвона-белы сцяг. І ўсё гэта ў сцюжу, вецер і снег.

Алег і ягоныя сябры — ужо зачараваныя вяршынямі. І такіх зачараваных вельмі многа — кожны дзень толькі на вяршыні Эльбруса ўзыходзіць каля шасцідзесяці чалавек. «Разумны ў гору не пойдзе, разумны яе абыйдзе. Няўжо на свеце столькі многа неразумных?» — жарт чалавека, які назіраў за турыстамі збоку. Алег жа разам з «неразумнымі» упэўнена пакрочыў далей.

Дарэчы, адна з самых модных турыстычных тэндэнцый у Амерыцы сярод бізнесменаў сярэдняга дастатку — «Вандраванні з прыгодамі». Набор самых папулярных «прыгод»: турпаходы з рукзаком за плячыма, марскія вандроўкі, ныранне з аквалангам, назіранне за акуламі, спуск на лыжах з гары, куды турыстаў дастаўляюць на верталёце. Але ўсё гэта — вельмі дарагія здавальненні. У нашым жа жыцці столькі ўсялякіх прыгод, што нават вандроўнік-амерыканец мог бы пазайздросціць. Але лепш самому шукаць прыгоды. Прыемныя. Вось і Алег вырашыў у хуткім часе ўзыйсці на Пік Камунізму. Здаецца, што гэты шлях — рэальны, і вяршыня — сапраўды дасягальная ў адрозненні ад набліжэння да абяцанага нам шчаслівага жыцця.

Таццяна КАЗАК.

Рамантыка бульбяной эпапеі

І ўсё ж яшчэ цяжка ўявіць сабе сельгаспаботы без студэнтаў, дарэчы, як і студэнтаў без сельгаспабот. Запаветная медыцынская даведка выратоўвае толькі самых хворых. Ці прадпрымальных. І хаця ў гэтым годзе сельгаспаботы — «па жаданню», амаль ніхто не рызыкнуў гэта праверыць: упіхнуўшы ў сумку гумовыя боты і целаграйку, раз'ехаліся па калгасах і саўгасах выконваць свой штогадовы «бульбяны» абавязак тысячы студэнтаў.

Мінула амаль два месяцы, як першыя атрады Беларускага дзяржаўнага універсітэта выехалі з Мінску на працу, і два тыдні — як апошнія вярнуліся. Можна падводзіць вынікі.

У гэтым годзе студэнтаў запрасілі да сябе гаспадаркі Вілейскага, Мядзельскага, Валожынскага, Старадарожскага, Нясвіжскага раёнаў. Але прынялі яны значна менш студэнтаў, чым было запланавана. Гэта здараецца не першы год, і як вынік — на працу паехалі толькі другія курсы (раней па спатры курсы кожнага факультэта). Зразумела, што на гэта ў гаспадарак свае прычыны.

А студэнтам трэба было толькі добра працаваць. Як гэта ў іх атрымалася, мяркуйце самі: студэнтамі біялагічнага факультэта (64 чалавека) за перыяд з 2 па 27 верасня выкапана 630 тон бульбы, хімічнага факультэта (27 чалавек) — 190 т. І ўвогуле, кожны студэнт за адзін працоўны дзень выкопваў у сярэднім па 400—500 кг. Калі гэтыя кілаграма-чалавека — дні перакласці на грошы, атрымліваецца: біяфак — 28 тыс., хімфак — 26.600, геафак — 20 тыс. Прыкладна такія заробкі і на астатніх факультэтах. Праўда, ад гэтых грошай амаль нічога не застаецца пасля ўтрымання аплаты за харчаванне. Наконт гэтага пашанцавала студэнтам геафака (к-с імя Маякоўскага Валожынскага раёна), якіх кармілі ў калгаснай сталоўцы бясплатна. Таму заробак у іх — 36 тыс. Значна менш пашанцавала іх адкурснікам, якія працавалі ў калгасе «1 Мая» таго ж раёна. Студэнты жылі на геастанцыі «Заходняя Бярэзіна» і самі арганізавалі харчаванне ў сталоўцы. Студэнты — кулінары добрыя. Прыгатуюць хутка і смачна. Але цяжка гэта зрабіць, калі выбар прадуктаў больш чым сціплы.

І зусім не пашчасціла студэнтам мехмата, якія харчаваліся ў калгаснай сталоўцы вёскі Буйкі (калгас імя Горкага Мядзельскага раёна). Ці кошт харчавання не адпавядаў меню, ці меню не адпавядаля кошту (а хутчэй і тое, і другое), але са студэнтаў за харчаванне ўтрымалі па 16 тыс. рублеў, пры заробку 18—25 тыс.

Не была таннай ежа і ў гападарках «Залужжа», «Дружба», «Барацьбіт» Старадарожскага раёна, дзе працавалі будучыя гісторыкі. Гаспадаркі не знізілі цану нават на тыя прадукты, што прывозіліся з палеў, фермы.

Дрэнна кармілі студэнтаў ФЭФа, якія працавалі ў калгасе імя Леніна Мядзельскага раёна. Усе гэта, канешне, не навіна. Студэнты заўсёды дрэнна харчаваліся, харчуюцца і будуць харчавацца. Гаспадаркі ж заведзены парадак, здаецца, парушаць не збіраюцца. І мех макаронаў у кутку сталоўкі падчас працы студэнтаў — таму пасведчанне.

Што да ўмоў жыцця, то гэта перш за ўсё адсутнасць абагравальнікаў, месца для прасушкі адзення. А калі ўспомніць, што ўвесь верасень ішлі дажджы, робіцца зразумелым, чаму кожны атрад адпраўляў па 5—8 чалавек дадому. А лазня? Раз у два тыдні, і тая кіламетраў за дзесяць.

Некаторыя гаспадаркі не паклапаціліся аб стварэнні ўмоў для працы. Напрыклад, дацэнт кафедры хімічнага факультэта І. Ф. Зіміна ў справаздачы, прадстаўленай ва універсітэт распавяла, што пры вызначэнні нормы ўборкі бульбы, не улічвалася якасць поля, несвоечасова вялося разворванне. Не выконваўся таксама дагавор па бытавым умовам, па аплаце кіраўнікам студэнцкай групы.

Будучым гісторыкам, акрамя бульбы, прапаноўвалі іншую працу, што не было прадугледжана ўмовамі дагавору. Звычайна студэнтам прапаноўвалася работа з больш нізкімі расцэнкамі. Адзначаны парушэнні з боку гаспадарак графікаў працоўнага дня.

Незадаволены гаспадаркай і студэнты механіка-матэматычнага факультэта, што працавалі ў калгасе імя Горкага Мядзельскага раёна ў верасні. Яны ўбачылі поўную бескантрольнасць. А вось выкладчыкі Міхась Міхайлавіч Якуш, Іван Іванавіч Прыходзька, Алег Аляксандравіч Аляшкевіч, якія працавалі са студэнтамі мехмата ў гэтай жа гаспадарцы, але крыху пазней (з першага па пятнаццатае кастрычніка) зразумелі, што скаргі скаргамі, а працаваць трэба. Узяўшы ініцыятыву ў свае рукі, яны, здаецца, устанавілі падчас сваёй працы парадак у калгасе. Пра работу студэнтаў сведчыць іх заробак: за 14 дзен па 30 тысяч. Акрамя таго, кожны атрымаў мех бульбы за добрую працу.

Акрамя ўжо названых праблем існавалі яшчэ вялікія ці малыя цяжкасці, напрыклад, канфлікты з мясцовай моладзю. Студэнтак аднаго з факультэтаў давялося вывезці з месца работы, у другім выпадку абыйшлося зваротам у міліцыю.

І ўсё ж студэнты працавалі. Па словах Анатоля Мікалаевіча Баранава, намесніка начальніка вучэбна-метадычнага аддзела, дапамога гаспадаркам была значная.

Праз колькі часу ўсе непрыемнасці забудуцца, і бульба застанецца самым яскравым успамінам студэнцкага жыцця. Песні пад гітару, паходы ў лес, цудоўныя сябры — ці ні гэта плата за працу?

Нават у гэтым годзе, калі ўзаемная непрыязнасць паміж студэнтамі і гаспадаркамі так абвострылася, адбылося неверагоднае: студэнты факультэта прыкладной матэматыкі настолькі пакарылі сваёй працай кіраўніцтва гаспадаркі Осаўскі Мядзельскага раёна, што яно ў сваю чаргу аб'явіла ўдзячнасць, узяла на сябе аплату за харчаванне і адправіла студэнтаў дадому раней запланаванага тэрміну.

Наташа КРЫШТОПЕНКА.

«ЗА ДВА ТЫДНІ Ў АМЕРЫЦЫ МНЕ НІ РАЗУ НЕ НАСТУПІЛІ НА НАГУ»

Не так даўно група студэнтаў нашага універсітэта (Іваноў Васіль, 4 курс мехмата; Надтачаеў Уладзімір, 4 курс гістфака; Плотнікава Юлія, 4 курс філфака; Гайсёнак Інэса, 4 курс фізфака; Аўчароў Дзмітрый, 4 курс факультэта радыёфізікі і электронікі) на чале з першым прарэктарам Пятром Дзмітрыевічам Кухарчыкам, наведалі Цэнтральны Мічэганскі універсітэт. Пра гэта і вядзе гутарку наш карэспандэнт.

— Кажуць, што ў дэлегацыі гэткага кшталту трапляюць людзі, якія маюць вельмі ўскоснае дачыненне да мэтаў такіх візітаў. Якія крэтэрыі адбору былі для вас?

Васіль: Аб тым, што праводзяцца абмены паміж студэнтамі Цэнтральнага Мічыганскага і нашым універсітэтам мы ведалі даўно і таму мэтанакіравана рыхтавалі сябе. Акрамя поспехаў у вучобе, ад нас патрабавалася і добрае веданне англійскай мовы. Але ж да самага апошняга моманту так і не ведалі, што паедзем менавіта мы. Усё вырашыла тэсціраванне, якое было праведзена перад самай паездкай.

— Мэтай вашага візіту было знаёмства з сістэмай вышэйшай адукацыі ў ЗША. Якім вы ўбачылі навучанне ва універсітэце амерыканскага тыпу?

Юлія: Сістэма навучання крыху адрозніваецца ад нашай. Універсітэт, у якім мы былі, вельмі прэстыжны, таму студэнты імкнуцца як мага больш эфектыўна скарыстаць гады навучання. Кожны студэнт павінен набраць пэўную колькасць лекцыйных гадзінаў, і, акрамя таго, здаць іспыты пасля кожнага курса. За два тыдні, што там былі, мы адчулі і недахопы іх сістэмы адукацыі.

— Ці наведвалі вы лекцыі?

Юлія: Так, я наведала заняткі па літаратуры, у прыватнасці слухала лекцыю па Фаусту. І вы ведаеце, зрабіла выснову, што ў нашым універсітэце лекцыю на гэтую ж тэму чытаюць значна грунтоўней. Напэўна, рацыяналізаванае грамадства не патрабуе глыбокіх філасофскіх высноў. Была магчымасць параўнаць, і я пераканалася, што мы пакуль не згубілі гэтай самай глыбіні.

Васіль: А я наведваў лекцыі па камп'ютарнаму праектаванню. Уражвае ўзровень тэхнічнай абсталяванасці. Нам такое і не снілася. Але ўзровень тэарэтычнай падрыхтоўкі выкладчыкаў, як мне падалося, мала чым адрозніваецца ад нашага.

— Сустракаючыся з амерыканскім студэнцкім асяродкам, вы, напэўна, параўноўвалі іх з нашымі студэнтамі. Заўважылі розніцу?

Уладзімір: Вялікай розніцы няма — студэнт, ён і ў Афрыцы студэнт. Хіба што багацейшыя яны за нас. Скажам, калі нам паказвалі універсітэт, экскурсавод падвёў нас да аўтастаянкі і спакойна паведаміў, што тут мы можам паставіць свае машыны. Уразіў спорткомплекс з саунай, басейнамі, трынажорнай залай. За невялічкую плату, па іх памерах (здаецца, долараў 180 ў год), студэнты карыстаюцца ўсім гэтым багаццем.

Юлія: Адразу заўважаеш уласцівую рысу амерыканскіх студэнтаў — раскаванасць. Ідучы па калідоры, мы маглі сустрэць студэнта, які ляжаў на падлозе і размаўляў па тэлефоне. Альбо на лекцыях. Нікога не здзіўляла баначка кокі, альбо пэпсі на стале, павольна пацягваючы якую, студэнт трывала засвойваў выкладзены матэрыял.

— І нічым гэтыя «свабольствы» не абмежаваны?

Уладзімір: Абмежаванні ёсць. І даволі строгія. Так, скажам, продаж гарэлкі вядзецца толькі тым, каму ўжо споўніўся 21 год.

Без адпаведнага дакумента ты не зможаш нават зайсці ў алкагольны бар. Напаўна, ёсць і іншыя абмежаванні, гэта толькі тое, што я бачыў увачавідкі.

— А ўмовы жыцця студэнтаў па-за межамі сценаў універсітэта?

Васіль: Студэнты, якія прыязджаюць на вучобу, жывуць у інтэрнатах (па два чалавекі ў пакоі). Харчуюцца ва універсітэцкіх сталоўках. Пра якія трэба распавесці асобна.

— Толькі, калі ласка, без здзекаў над страўнікамі сваіх суайчыннікаў, у свядомасць якіх трывала ўвайшла ідыёма «калі студэнт, дык абавязкова галодны».

Уладзімір: Добра. Скажу толькі, што мы не першая дэлегацыя з Беларусі. Нам расказвалі пра выпадкі абжорства з боку нашых студэнтаў былых заездаў. Сакрэт у тым, што са сталоўкі ты можаш вынесці альбо адзін банан, ківі, апельсін, ці што-небудзь гэткага кшталту, альбо окажу адно марозіва. У самой жа сталоўцы ты можаш есці столькі, сколькі зможаш (а гэта: салата з ананасаў, дэлікатэсныя стравы, аб існаванні якіх мы і не здагадваліся). Вось таму і такія сумныя вынікі.

— Дарэчы, пра сумныя вынікі. Вы, здаецца, былі ў Амерыцы пад час Маскоўскіх падзей?

Юлія: Так. Калі ўсё гэта пачало закручвацца, мы прыпалі да тэлевізараў і, высветлілася пазней, глядзелі тое ж самае, што і вы — «Сі Эн Эн». Перапужаныя амерыканцы падыходзілі да нас з вачыма, большымі за акуляры і спачувалі. Некаторыя пыталіся пра наша стаўленне да падзей. Самі ж мы перажывалі вельмі. Раптам прыедзем. а Беларусь ужо не Беларусь, а «Северо-Западный край».

— А якое стаўленне амерыканцаў да нашай краіны?

Уладзімір: Здаецца, яны нічога пра Беларусь не ведаюць. Прыходзілася тлумачыць. Але ж некаторыя ведалі. Прыемна здзівіліся , калі пры наведванні фермы (а было і такое) убачылі трактар «Беларусь», аб якім чулі даволі добрыя водгукі. Хіба не рэклама нашай дзяржаве?

— І не з'явілася жадання застацца ў «краіне-казцы»?

Юлія: Ну, не такая яна ўжо і казка. Гэта мы адсюль бачым усё ў ружовым святле. На самай справе там таксама ёсць свае цяжкасці і з вышыркамі насустрач да нас там ніхто не пойдзе. Гэта мы зразумелі. Але ж, перад тым, як адкрыць нам візу на ўезд у ЗША, нас доўга марудзілі: «застанецеся — не застанецеся...»

Уладзімір: Калі толькі ажаніцца з якой-небудзь амерыканкай (смяецца).

— А як амерыканкі на ваш густ?

Васіль і Уладзімір: Беларускі лепей. Бліжэй (зноў смяюцца).

— А што яшчэ вы паспелі пабачыць?

Уладзімір: Наведалі кампанію «Джэнерал-Мотарс». І не столькі ўразілі тыя памеры і тэхнічнае абсталяванне (ад гэтага хутка стамляешся), колькі дробязі, якія зачароўваюць не менш, чым усё астатняе.

Васіль: Была цікавая экскурсія (ніколі не здагадаецеся куды) — у турму. Так, так. У сапраўдную амерыканскую турму. У нашай я не быў, так што параўноўваць няма з чым, але ж здзівілі ўмовы, у якіх жывуць зняволеныя: каляровы тэлевізар, пляцоўкі для прагулак, утульныя пакойчыкі — усё гэта неяк не стасуецца ў маёй свядомасці з умовамі жыцця чалавека, пазбаўленага свабоды.

— Пытанне да кожнага. Паспрабуйце ўзгадаць самае яскравае ўражанне.

Юлія: Для мяне, як ні дзіўна, гэта сустрэча ў Амерыцы з Еўтушэнкам. Вы не памыляецеся, так-так, з тым самым — паэтам. Што ён там рабіў? Прэзентаваў кніжку сваіх вершаў у перакладзе на англійскую мову. І ён здзівіўся, калі нас пабачыў. А як мы ўзрадаваліся, атрымаўшы аўтографа. А яшчэ ўразіў велізарны крыж, здаецца, самы вялікі ў свеце, драўляны. Убачыла я яго нечакана, ля возера, на паляне.

Уладзімір: Кантраст паміж намі і імі. І хай сабе кажуць пра дзяжурную амерыканскую ўсмешку — усё роўна прыемна. І — шаноўная спадарыня Ветлівасць! «За два тыдні прыбывання, мне ні разу не наступілі на нагу»,— узгадваю я, ціскаючыся ў аўтобус аэрапорта Шарамецьева.

Васіль: Мне цяжка вызначыць. Усё невядомае, усё цікавае. Павінен прайсці час, жмуха адпадзе і тады...

— А я хацеў бы падзякаваць за размову і пажадаць яскравых уражанняў не толькі ў Амерыцы, але і на роднай зямельцы.

Гутарку вёў Юрась КАРМАНАЎ.

АЎДЫТОРЫЯ № 7

АС\ДС — РОКАВАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ, ЯКАЯ Б'Е ПА ГАЛАВЕ

Рок, пра які мы жадаем расказаць, праверaны часам, высока ацэнены самымі рознымі аўдыторыямі слухачоў, а значыць, набыў зусім іншую па якасці папулярнасць, чым вядомы цяпер гурт «Мальчишник».

Мы маем намер пісаць пра сур'ёзную музыку сур'ёзна. Матэрыялы пра яе адсочваліся ў розных замежных выданнях, пераводзіліся на рускую мову і сістэматызаваліся Уладзімірам Зайчанка і яго сябрамі, дарэчы, усё апошняе дзесяцігоддзе. Нагадаем, што Уладзімір Зайчанка — прэзідэнт мінскага рок-клуба з 1987 года, аўтар шмалікіх вядомых у вузкім коле песень, вядучы перадачы «Рок-архіў» на беларускім тэлебачанні.

● ● ● ● ●

«У нашай рэчцы дохнуць карасі, як на дыскатэцы грае АС/ДС...»
(кагасна-гарадскі фальклор сярэдзіны 80-х гадоў).

БАГАТА ШУМУ, МАЛА СЕКСУ

«Нашае імя ніколі не звязвалася з сексам»,— бурчыць рытм-гітарыст АС/ДС Малькольм Янг, пры гэтым ён падае стомлены пасля канцэрта па канапу ў грымёрнай і адначасова адказвае на якое-небудзь нясціплае пытанне надакучлівых журналістаў. Сапраўды, які можа быць секс у Малькольма пасля вельмі цяжкага двухгадзіннага канцэрта. І што толькі не прыйдзе ў галаву гэтым разбэшчаным пісакам!

Што ж азначаюць гэтыя магічныя ініцыялы, надрапаныя нажом, цвіком або намаляваныя фарбай мясцовымі фанамі на сценах дамоў, агароджах, у пад'ездах, прыбіральнях? У двух словах — гэта тэхнічнае сленгавае абазначэнне выключальніка пастаяннага-пераменнага тока. Цяжка прыдумаць больш папулярную назву.

«Мы заўсёды ганарыліся сваёй славай гучнага гурта,— працягвае Малькольм Янг.— Калі прыходзіцца рабіць музыку, мы зыходзім з ідэі, што вы ўсе любіце прастату і гучнасць...»

Здаецца, ні ў каго яшчэ канцэрты не трымаюцца на прастаце і гучнасці, як у АС/ДС, хоць ціхімі і сціплымі ў адносінах да гука іншых «металічных рабят» таксама не назавеш. Ну, а прасцей, чым у АС/ДС, цяжка і прыдумаць. Мажліва, менавіта гэтая знешняя, здавалася б, прастата, добра вышуканая даходлівасць і прывялі пяцёрку да вяршынь славы рок-музыкі, паднялі яе з бяздані невядомасці ў лік найбольш паспяваючых рок-калектываў свету. У нашай рэспубліцы, магчыма, цяпер АС/ДС уваходзіць у «пяцёрку» самых паважаных гуртоў. А пачыналі АС/ДС дваццаць гадоў таму з таго, што, даведаўшыся, дзе жыве найбольш вядомы дыскжакей Сіднейскага радыё, падкідвалі яму ў кватэру касеты з запісам сваіх песень у спадзяванні на тое, што ён рызыкне што-небудзь пракруціць у эфіры.

«КАЛІ ТЫ ЖАДАЕШ КРЫВІ — АТРЫМАЙ...»

Ва ўсіх афіцыйных рок-энцыклапедыях і даведніках гурт АС/ДС лічыцца аўстралійскім, хоць самі яго ўдзельнікі на гэта ўжо даўно забыліся.

І сапраўды, два асноўных музыканта гурта — браты Малькольм і Ангус Янг — нарадзіліся ў г. Глазга ў Шатландыі, а пераехалі разам з сям'ёю ў Аўстралію і пасяліліся ў Сіднеі толькі тады. калі аднаму было ўжо 8, а другому — 5 гадоў. На іх першым альбоме, які быў запісаны ў 1975 годзе, у якасці фірменнага сімвала на вокладцы прысутнічала трансфарматарная будка, а сам альбом меў назву «Высокае напружанне» (праз 17 гадоў гэтае спалучэнне дайшло і да нашага «рэпавага куміра» — спадара Б. Цітаміра). На вокладцы таго першага альбома былі прыведзены і вытрымкі з лістоў дырэктара сярэдняй школы містэра Лемінга да бацькоў братоў Янгаў: «Усе настаўнікі ідуць да мяне са скаргамі на непрыстойную лаянку і непрыстойныя жэсты вашых сыноў. Малькольм ужо не маленькі хлопчык, ён павінен разумець, што ягонае неперапыннае гудзенне не выклікае добрых уражанняў і нікога не весяліць... Ангус увесь час есць шакаладныя цукеркі. Ягоная форма замызганая, калені ў сіняках і ранках. Калі ласка, пагаварыце са сваімі сынамі».

Калі Ангус і Малькольм вучыліся ў школе, іх старэйшы брат Джордж ужо іграў у вядомым у Аўстраліі гурце «EASY BITS» і, вядома ж, распавядаў пра прывабнасці артыстычнага рок-жыцця. Ангус пачаў браць урокі ігры на гітары з 11 гадоў. Але больш, чым год, не здолеў вытрымаць. Пачаў іграць у школьных гуртах. Праз тры гады ён далучыўся да гурта свайго брата, які і называўся АС/ДС.

Малькольм стварыў свой гурт у канцы 1973 года ў Сіднеі. Спачатку ён існаваў як тры музыкантаў са спевакам Дэйвам Эвансам. Першае выступленне АС/ДС адбылося пад Новы год — 31 снежня 1973года.

У пачатку наступнага года гурт быў рэфармаваны ўжо ў новым складзе: Малькольм і Ангус — гітарысты, Марк Эванс — бас-гітара, Філ Руд — ударныя.

Спачатку вакалістам заставаўся Дэйв Эванс, але пад час першай жа паездкі гурта на гастролі за межы горада яго замяніў вадзіцель іх аўтобуса, які таксама спяваў і іграў на ўдарных у аматарскіх гуртах, што выконвалі рытм-н-блюзавыя песенькі. Гэтым вадзіцелем, родам таксама з Шатландыі, новым для АС/ДС вакалістам быў Рональд Белфард, які выступаў пад псеўданімам Бон Скот у гуртах «SPECTRES», «VALENTINES» і «DRATERNITY». Прадзюсерам гурта быў старэйшы брат Джорж. Першыя дзве кружэлкі выйшлі адразу ж на працягу аднаго года, і гурт сабраўся на першыя гастролі ў Англію.

Перад паездкай дырэкцыя буйнейшага універмага Сіднея «Майер», каб прыцягнуць пакупнікоў, прапанавала гурту даць адзін канцэрт пад час абедзеннага перапынку прама ў адной з гандлёвых залаў. Канешне, наладжвальнікі канцэрта адразу пра гэта вельмі пашкадавалі — з першых жа акордаў АС/ДС пачаўся сапраўдны жах: натоўп кінуўся разбураць прылаўкі, пад агульны шум было здзейснена шмат крадзяжоў.

У 1976 годзе ў Англіі АС/ДС ніхто не ведаў. Гастролі ладзіліся газетай «САУНДС» і фірмай грамкружэлак «Атланцік». Гледачам прапанаваўся вечар відэафільмаў — наказ канцэртаў вядомых гуртоў накшталт «XV», «Лед зепелін» альбо «Дзіп Пёрпл», а на заканчэнне — выступленне аўстралійцаў. Іх гастролі праходзілі пад лозунгам «Хавайце сваіх дочак» — па назве адной з песень АС/ДС. Гастролі не мелі поспеху, некаторыя газеты назвалі гэта проста правалам. Прэса, спачатку абвясціўшая гурт новымі «прарокамі рока», потым абвінавачвала іх у пошласці і дрэнным гусце. На канцэртах нават з'яўляліся афіцэры паліцыі з аддзела па барацьбе з непрыстойнасцямі — правяраліся чуткі пра тое, што Ангус Янг занадта захапляецца, здымаючы з сябе на канцэртах школьную форму. Забягаючы наперад, можна адзначыць, што трук з распрананнем зрабіўся адным з «каронных» фірменных нумароў на ўсіх канцэртах гурта, і потым ужо нікога не здзіўляла тое, што Ангус распранаецца амаль да апошняга і нават паказвае ўсім гледачам сваю «заднюю частку». Аднойчы, на адным з канцэртаў 86-га года, Ангус так разыйшоўся, што павярнуўся тварам да залы, што было адразу ж зафіксавана шматлікімі фатографамі. Здаецца, гэты фотаздымак абыйшоў паўсвета. А на пытанне, што яго падштурхнула на гэта, Ангус проста адказвае: «А чорт яго ведае!»

У 1977 годзе ў Англіі пачалася эра панкаў, іх поспех дайшоў і да Аўстраліі. АС/ДС абвінавачвалі і раней, што яны разбэшчваюць падрастаючае пакаленне сваімі нецэнзурнымі песнямі. З-за адсутнасці іншага эквівалента АС/ДС замяніў сабой у Аўстраліі «Секс Пістолз». Так, падчас аднаго выступлення на тэлебачанні вядучы праграмы прадставіў іх як самы скандальны гурт у Аўстраліі і папрасіў сказаць што-небудзь непрыстойнае. Малькольм Янг так абурыўся, што проста ўстаў і пайшоў са студыі. За ім кінуўся вядучы: «Не маглі б вы яшчэ раз з такім жавось абурэннем выйсці са студыі. У першы раз аператар не паспеў вас заснаць».

Летам 1977 года АС/ДС адправіўся ў першае вялікае турнэ па ЗША. У Галівудзе, выступаючы на фестывалі, яны аддалі грошы ахвярам мускульнай дыстрафіі. З гэтай нагоды мэр Галівуда ўручыў ім ключ ад горада. Падчас таго ж турнэ Ангус упершыню выкарыстаў тэхнічную навінку — бесправадковую радыёгітару. Цяпер ён мог колькі заўгодна насіцца па сцэне, вырабляць піруэты, катацца па падлозе, не рызыкуючы заблытацца ў шнурах, як сасіска ў макаронах.

Магчыма, ужо тады была распрацавана асноўная канцэпцыя паводзін музыкантаў на сцэне, якая застаецца нязменнай і па сённяшні дзень: на задзім плане ў цэнтры — подыум з барабаншчыкам, злева і справа ад яго Малькольм Янг і бас-гітарыст, утрох яны ствараюць магутную рытм-секцыю. Яны статычныя, «прывязаныя» да мікрафонаў і ствараюць «тыл» для «адвязаных» вакаліста і Ангуса Янга, які бегае галопам па сцэне. Кожны вельмі дакладна ведае сваю мяжу на сцэне і нават з заменай музыкантаў гэтая «рокава-балетная» харэаграфія застаецца нязменнай. Нязменнымі застаюцца і гітары, на якіх працягваюць іграць два дзесяткі гадоў Малькольм і Ангус. Ангус — адзін з нямногіх сола-гітарыстаў «хард-рока», які ўвесь час іграе толькі на гітары «гібсон» мадэлі «СГ-стандарт». Аднак вернемся назад, у сярэдзіну 70-х...

Новыя гастролі 1978 года праходзілі ўжо зусім у іншых абставінах — гурт быў добра вядомы. Да таго часу АС/ДС выпусціў ужо шэсць кружэлак: пасля «POVVER *ACE*» (май) у тым жа годзе выйшла ў кастрычніку і «Калі жадаеш крыві, ты яе атрымаеш...». Пад такім крывавым» лозунгам праходзілі гастролі і гэтага года. У той час адбыўся адзін цікавы выпадак з Бонам Скотам — перад канцэртам ён выйшаў падыхаць свежым паветрам, але назад зайсці ўжо не змог — шлях перагарадзіла ахова, якую запрасіла адміністрацыя дзеля сцішэння натоўпу. Гэтыя грамілы, вядома ж, не жадалі паверыць, што Скот, а выглядаў ён як просты абарванец у старых джынсах і жылетцы на голае цела, і ёсць рок-спявак з вядомага гурта, які павінен зараз выступаць. Спатрэбілася паўгадзіны, каб угаварыць пільных вартаўнікоў пусціць Скота ў залу.

Гастролі ў Англіі былі заканчэннем сусветнага турнэ, якое доўжылася больш за 6 месяцаў. Музыканты зусім стаміліся, таму што працавалі сумленна, без выхадных, патуранняў на стомленасць, здароўе альбо дрэннае надвор'е.

ПЛАЦІНАВЫ «ШЛЯХ» У ПЕКЛА»

У 1979 годзе іх фірма «Атланцік» вырашыла, што для гурта прыйшоў час змяніць прадзюсера.

Да гэтага часу ўсе шэсць кружэлак запісваў старэйшы брат Джордж Янг, які трымаўся цяжкага «бруднага» гука. Аднак, на думку фірмы, гурт павінен быў зрабіцца менш «цяжкім», больш пацяшальным і камерцыйным. Гэтая кардынальная перамена гучання гурта з «хэві-метал» на «цяжкі рок-н-рол» таксама была выклікана і тым, што ў ЗША немагчыма дабіцца поспеху без падтрымкі радыё, без шмалікіх «пракручванняў» песень на мностве камерцыйных, дзяржаўных і прыватных радыёстанцыях, дзе радыёпрадзюсеры, у сваю чаргу, пазбягаюць «брудных» кружэлак, гэта значыць альбомаў, запісаных непрафесійна альбо недастаткова чыста па якасці. Пасля некалькіх спрэчак і пошукаў Джорджа Янга ўдалося «выставіць за дзверы», а на яго месца паставіць вядомага прадзюсера гуртоў «новай хвалі» Роберта Джона Ланга. У выніку гэтага супрацоўніцтва атрымаўся альбом «Шлях у пекла», які выйшаў у жніўні 1979 года. Гэта была першая кружэлка, якая зрабілася ў ЗША «плацінавай» па продажу і атрымала вялікую вядомасць у свеце. Бон Скот тады сказаў пра яе: «Гэта па-ранейшаму цяжкі рок. Але больш меладычны. Ланг зрабіў гук больш насычаным, мажліва, больш камерцыйным».

Зараз можна сказаць, што пасля запісу «Шляху ў пекла» АС/ДС не прадпрымаў якіх-небудзь «рэвалюцыйных» змяненняў у сваім гучанні. Іх узыход на вяршыні рок-славы быў падобны на класічны галівудскі сюжэт. Але якраз у той момант, калі ў гэтай бойцы атрымана перамога, здарылася няшчасце — спявак Бон Скот знайшоў сваю смерць у аўтамабілі на ўскрайку Лондана, зрабіўся ахвярай вялікай дозы алкаголя страшэнна марознай ноччу зімою 1980 года.

ЦЕРАЗ СМЕРЦЬ — ДА СЛАВЫ

У той час гурт запісваў матэрыял для новага альбома. 19 лютага Бон Скот вырашыў адпачыць са сваім сябрам ад работы і накіраваўся ў клуб «Мьюзік машын». Клуб уяўляў сабой тэатр, у якім трэці і чацвёрты ярусы былі закрыты, на балконе знаходзіўся бар, дзе прадавалі спіртное, а ўнізе ўсё было расчышчана для танцаў. Размаўляць тут было немагчыма, бо апаратура ўключалася на страшэнную гучнасць — на сцэне выступалі гурты «цяжкага рока». Бон Скот прабыў у клубе да трох гадзін ночы, рэгулярна падыходзячы да стойкі бара. Яго сябар падчас расследавання паказаў, што Скот выпіў не менш за сем падвойных порцый віскі. Порцыя па-англійску — 24 грамы. Сем падвойных — 336 грамаў. Гэта адна поўная шклянка і яшчэ крыху. Зразумела, для нашых аматараў спіртнога доза выглядае занадта смехатворнай «размінкай» перад сур'ёзнай «накачкай». Для англійскага рок-спевака яе было больш чым дастаткова — Бон заснуў на заднім сядзенні аўтамабіля, і яго сябар вырашыў там яго і пакінуць — несці Скота на сабе дадому ён быў не ў стане. У машыну ён зазірнуў на наступны дзень пасля абеду — Бон Скот ляжаў, не падаваючы прыкмет жыцця. Урачы вызначылі, што памёр ён у выніку асфіксіі — проста захлынуўся, лежачы на спіне.

Зразумела, на гурт і на Скота накінуліся газетчыкі, называючы яго алкаголікам і нават наркаманам. Аднак самі АС/ДС зрабілі афіцыйную заяву, што падчас гастроляў Скот ніколі не падводзіў гурт па якіх-небудзь прычынах, а за апошні 1979 год яны далі 250 канцэртаў! Толькі адзін раз Скот сеў не ў той самалёт з-за таго, што хацеў пазнаёміцца з прыгожай дзяўчынай. І зразумела, наркаманам ён не быў.

Трагедыя нагадала музыкантам, што нават такая добрая кар'ера можа быць перакрэслена няшчасным выпадкам. Тое, што здарылася, узрушыла гурт. Пагражала распадам усяго калектыва. Аб гэтым адразу ж папаўзлі чуткі. У адносінах да музыкантаў паявіўся холад, шчасце здрадзіла ім.

«...Мы ішлі праз перыяд, які ўнёс вялікую сумятню ў наша жыццё.— прыгадваў Малькольм Янг.— Мы не ведалі, ці варта нам працягваць іграць далей без Бона... Усё гэта было вельмі цяжка. Але праз некалькі месяцаў мы зноў адчулі ў сабе «кліч рок-н-рола». Мы сабраліся, і калі пачалі іграць, дык зразумелі, што так любім рок-н-рол, што ўжо ніколі не зможам спыніцца».

Атрымалася, што смерць Бона Скота стала каталізатарам для АС/ДС у дасягненні далейшага поспеху. Напачатку газеты абмяркоўвалі саму трагедыю, потым яе прычыны і следствы. Нарэшце, надыйшла чарга ўгадвання ўсіх прэтэндэнтаў на месца вакаліста.

(Працяг у наступным нумары).

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, І-ы Загарадны зав., 3

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

28 кастрычніка
Зак. 1709.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.